**Сутула, Г.** Дата. «Вайна прайшла праз тры пакаленні майго роду» / Г. Сутула // Веснік Глыбоччыны. — 2023. — 15 лют. — С. 4.

## ДАТА. «ВАЙНА ПРАЙШЛА ПРАЗ ТРЫ ПАКАЛЕННІ МАЙГО РОДУ»

**Віктар Меніцкі** *(на здымку)* **з Псуі – воін-інтэрнацыяналіст, салдат у трэцім пакаленні. Прайшоўшы Афганскую вайну, ён зведаў цану жыцця і сцвярджае, што мір, заваяваны дзядамі і прадзедамі, – найбольшая каштоўнасць.**



**Віктар Меніцкі: дарогамі памяці.** Фота Анастасіі СТАНКЕВІЧ

### Гераічная радня

– Вайна прайшла праз тры пакаленні майго роду, пачынае нялёгкі аповед Віктар Альфонсавіч. – Дзед Іосіф, ураджэнец Ушаччыны, ваяваў у гады Грамадзянскай вайны. Быў параненны, без нагі вярнуўся дамоў.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны пайшоў на фронт мой бацька Альфонс Іосіфавіч. Служыў у 83-й марской пяхотнай брыгадзе. Вызваляў гарады на ўзбярэжжы Чорнага і Азоўскага мораў, з баямі прайшоў Румынію, Югаславію, Венгрыю, сустрэў перамогу ў Аўстрыі. Быў двойчы паранены. За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Вялікай Айчыннай вайны II ступені і Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу».

З першых дзён нямецкай акупацыі ў партызанскім атрадзе была мая мама-падлетак Анастасія Аўласёнак са старэйшым братам Васілём. Падчас прарыву нямецкай блакады каля Ушач у маі 1944 года яна была паранена, а яе брат, мой дзядзька Васіль, загінуў каля Ветрына, куды ў якасці адцягваючага манеўра была скіравана група партызан. Яго астанкі перазахаваны ў брацкай магіле на Ушаччыне напярэдадні адкрыцця мемарыяльнага комплексу «Прарыў». Яшчэ адзін мой дзядзька па бацькавай лініі загінуў у 1944 годзе пры вызваленні Луганска. Стаць у баявы строй мне давялося ў снежні 1979 года.

### Служба пад прыкрыццём

Віктар служыў у Мінску ва ўнутраных войсках, якія былі задзейнічаны на ахове штабоў Беларускай ваеннай акругі. Восенню з іх роты выбралі восем чалавек і накіравалі ў вучэбна-трэніровачны цэнтр. Пасля гэтага экіпаж у складзе вадзіцеля-механіка, прапаршчыка і афіцэра сваім ходам на «газоне» адправіўся ва ўкраінскі Гастомель. Туды, на базу адной з воінскіх часцей, прыбылі экіпажы з усіх ваенных акругоў Савецкага Саюза – чалавек 150. Тэхніка і ваенныя загрузіліся ў вялізны АН-24, які ўзяў курс на Афганістан. Толькі перад пасадкай у самалёт ваеннаслужачыя даведаліся, што паступілі ў распараджэнне ўпраўлення войск КДБ і будуць служыць пад прыкрыццём пры ўзаемадзеянні з войскамі афганскай урадавай арміі.

– Нам выдалі чамаданы з адзеннем: ад бялізны да паліто і капелюшоў, замест пашпартоў і ваенных білетаў – замежныя пашпарты. Я па дакументах быў работнікам аховы здароўя, а на самой справе – вадзіцелем-механікам. Нас даставілі ў Баграм за дваццаць тры дні да ўводу савецкіх войск у Афганістан. Там расправілі каго куды, а групу ў складзе 13-ці ваенных, у тым ліку і мяне, накіравалі ў Герат, – расказвае мужчына. – У Гераце, адным з трох найбуйнейшых гарадоў Афганістана, размешчаным у даліне ракі Герыруд, дыслацыравалася дывізія афганскіх войск. Паблізу іх мы разбілі свой лагер, абуладкавалі быт.

У Афганістане ўсё было не такім, як у Беларусі: клімат, традыцыі, мова, прырода. Напрыклад, ноччу ў гарах мароз да мінус дваццаці – не ведаеш, што апрануць, каб не замерзнуць, а ў нізінах – духата. Небяспека на кожным кроку: ядавітыя змеі, скарпіёны, у дадатак – розныя інфекцыйныя хваробы, бо праблемы з вадой, гігіенай і санітарыяй. Была праблема і іншага характару – бытавога забеспячэння і бяспекі. Мы ў Афганістане знаходзіліся на правах грамадзянскіх асоб. Каб не выдзяляцца сярод мясцовых, як і яны, адпусцілі бароды. Куплялі сабе ежу на рынках, абмундзіраванне, зброю, патроны, бо трэба было сябе ахоўваць. Нам плацілі па 6,5 тысячы афганяў у месяц (на нашы 450 рублёў), і за іх мы куплялі ўсё неабходнае. Па абавязку службы цесна супрацоўнічалі з гарадской адміністрацыяй Герата і нашымі саветнікамі, бо акрамя ваеннай місіі ў нас была і грамадзянская. За час нашага знаходжання мы пабудавалі ў Гераце дзве школы, хлебазавод, мясакамбінат, банк, куды асабіста я завозіў першыя грошы. Але гэта, як кажуць, бытавы бок вайны, а быў яшчэ і трагічна-баявы.

### Дарогамі Афганістана

– Мы неаднойчы разам з афганскімі ваеннымі ў складзе аўтамабільных канвояў на БТР-60 з камандзірам і радыстам-кулямётчыкам дастаўлялі зброю і харчаванне ў далёкія горныя заставы. На дарогах, якія серпанцінам абвівалі горы, у вузкіх цяснінах, якія душманы ператваралі ў лавушкі, паляглі дзясяткі савецкіх ваеннаслужачых. У нашай групе былі людзі розных нацыянальнасцей, а з

землякоў – адзін палкоўнік Андзілеўка з Шаркаўшчынскага раёна. Аднойчы ён з чатырма салдатамі і служачымі афганскага батальёна дастаўляў у горную заставу чарговы груз. Узарваная на іх шляху гара перакрыла дарогу наперад, а ззаду былі духі з аўтаматамі... Калі палкоўнік перастаў выходзіць на сувязь, мы паехалі на пошукі. Убачылі жудасны малюнак: на дарозе ляжалі знявечаныя, з павыразанымі на целах зоркамі, нашы хлопцы. Афганцаў не было: яны перайшлі на бок духаў. Патрыятызм, афганскіх ваенных вымяраўся пэўнай сумай аплаты за паслугі, таму падобныя выпадкі здрадай не лічылі. Затое, калі яны знішчылі няверных, станавіліся «героямі».

Аднойчы ў перадзелку трапіў і я. Мы дастаўлялі груз пад іранскую мяжу. Ехалі калонай, спераду сапёр-афганец з мінашукальнікам. Гарачыня, ехалі паволі, з адчыненымі дзвярамі, і гэта мяне ўратавала. Ці наўмысна, ці выпадкова сапёр прапусціў міну, і рванула яна якраз пад калёсамі майго ГАЗ-66. Афіцэр, які сядзеў побач, адразу загінуў, а мяне ўзрыўной хваляй выкінула з кабіны. Атрымаў кантузію, але застаўся жывы. Беспрытомны, у шпіталі я крычаў і гаварыў па-руску, і ўрач паставіў ля майго ложку ахову, каб мясцовыя мяне не забілі. Праз трое сутак вярнуўся ў Гёрат і працягваў службу, – гартае балючыя ўспаміны мой суразмоўца. – Аднойчы я і саслужывец Алег з Бранскай вобласці разам з саветнікам, маёрам Агеевым, і афганцамі ехалі ў Шындант. На адным з прывалаў маёр, нібы адчуваючы бяду, перасадзіў нас з БТРа на ЗІЛ. Праз нейкі час афганскі служачы, вадзіцель-механік БТРа, рэзка затармазіў і раптоўна скіраваў машыну на прыдарожную скалу, з якой яна, куляючыся, паляцела ў бездань. Узарвалася, і з яе, як вогненныя свечкі, вывальваліся пылаючыя людзі. Мы кінуліся ратаваць маёра. Дабеглі, пачалі сцягваць з яго адзенне, але разам з ім, нібы пальчаткі з рук, стала здымацца абгарэлая скура. Мы тады палітом тушылі валасы і цела. Пагрузілі яго ў ЗІЛ і павезлі ў шпіталь. Духі стралялі ўслед, але нам удалося ўцячы...



**Служба ў Афганістане.** Фота з сямейнага архіва.

**Байцы нябачнага фронту**

Віктар дэмабілізаваўся ў ліпені 1981 года.

– Мы вярнуліся на радзіму. Аказалася, што перыяд нашай службы ў ваенныя білеты не ўнеслі, пад прынятыя льготы для воінаў-інтэрнацыяналістаў мы не падпадалі. Доўга вялі перапіску з Масквой, і толькі ў 1987 годзе нас унеслі ў спісы ваеннага кантынгенту, які выконваў інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане, – гаворыць Віктар Альфонсавіч. – У тым жа годзе мяне ўзнагародзілі медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», у 1988 – граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

І хоць вайна яшчэ доўга не адпускала яго, памалу-паціху лячыла мірнае жыццё. Ажаніўся. Выхоўваў сына і дачку. Трыццаць два гады адпрацаваў у ААТ «Полацк-Шкловалакно». Падчас камандзіровак на Тайвань і ў Кітай вучыў замежных калег прамудрасцям сваёй прафесіі.

Цяпер Віктар Альфонсавіч на заслужаным адпачынку. Чакае ў госці дзяцей і ўнукаў, якіх у яго чацвёра. Сустракаецца са школьнікамі, расказвае ім пра Афганскую вайну, заклікае маладое пакаленне цаніць мір і жадае толькі аднаго: каб у жыццё дзяцей і ўнукаў ніколі не прыйшла вайна.